УДК 338.48:502+504.03(476)

Н.Е. Захарава, канд. філас. навук
(Інстытут філасофіі НАН Беларусі, г. Мінск)

# ЭКАЛАГІЧНЫ ТУРЫЗМ ЯК ФАКТАР УСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ САЦЫЯПРЫРОДНАЙ ПРАСТОРЫ БЕЛАРУСІ

Станаўленне і паглыбленне экатурызму азначае спалучэнне падарожжа з беражлівым стаўленнем да прыроды і дазваляе аб'яднаць радасць знаёмства і вывучэння ўзораў флоры і фауны з магчымасцю садзейнічаць іх абароне. Беражлівыя адносіны да мясцовых аб'ектаў флоры і фауны, прыродных, геаграфічных і геалагічных аб'ектаў сэнсавы змест паняцця «экалагічны турызм» [1]. З'яўленне экатурызму і яго хуткае распаўсюджванне тлумачыцца рэфлексіяй грамадства на экалагічныя змены, выклікана імкненнем звесці да мінімуму змены навакольнага асяроддзя. Экатурызм гэта адмысловы сектар турысцкай сферы, які разумее імкненне ў першую чаргу да зносін з прыродай, спазнанню яе аб'ектаў і з'яў, актыўнаму адпачынку, рэсурсазберажэнню і нават працы па ўзнаўленні прыродных аб'ектаў.

У Рэспубліцы Беларусь Нацыянальная праграма развіцця турызму на 2021-2025г. называецца "Беларусь гасцінная" [2]. У 2019 г. Белавежская пушча трапіла ў топ-25 найлепшых напрамкаў для падарожжаў па версіі часопіса «National Geographic Traveler». Французскае выданне "Le Figaro" назвала Беларусь "спячай прыгажуняй Еўропы" і ўключыла нашу краіну ў дваццатку лепшых напрамкаў для турызму ў 2020 г. [2]. Складальнікі рэйтынгаў часцей за ўсё вылучалі такія турыстычныя вартасці Беларусі, як шматдзённы бязвізавы рэжым, чысціня і бяспека, архітэктурная спадчына г. Мінска, багатая колькасць кафэ і арт-пляцовак, шырокія лясы і шматлікія нацыянальныя паркі [3]. Праграма змяшчае раздзел "Экалагічны турызм" з дадатковым падраздзелам "Экалагічныя гасцініцы", што сведчыць аб арыентацыі на экалагічную тэматыку дзяржаўнай палітыкі турызму. Гэта дазволіць не толькі паскорыць развіццё ў Беларусі турызму, арыентаванага на экалагічную праблематыку і непасрэдна экалагічнага турызму, але і аказаць істотную падтрымку адукацыйным праграмам па ўстойлівым развіцці краіны, павышэнні ўзроўню экалагічнай культуры насельніцтва рэспублікі.

У сваёй найпростай форме экатурызм уяўляе сабой падарожжа (як бы ўявіць) «сярод прыроды». У больш развітай форме ён ахоплівае ўсе бакі жыцця, куды ўваходзяць: жывельны свет, расліны свет, разнастайнасць жыццёвых форм, стабільныя віды эканомікі, ахова навакольнага асяроддзя, культура, гістарычная спадчына, грамадства і чалавек [1].

Згодна з азначэннем Таварыства экатурызму (ЗША), «экалагічны турызм гэта вандраванні ў месцы з адносна некранутай прыродай. Такія падарожжы не парушаюць цэласнасці экасістэм і арыентаваны на атрыманне ўяўлення аб прыродных і культурна-этнаграфічных асаблівасцях дадзенай тэрыторыі. Адначасова экатурызм стварае такія эканамічныя ўмовы, калі ахова прыроды становіцца выгаднай мясцоваму насельніцтву». Іншымі словамі, «экатурызм - гэта ўстойлівы і прыродна-арыентаваны турызм і рэкрэацыя [4].

Найважнейшымі фактарамі развіцця экатурызму, як і турызму ўвогуле з'яўляюцца прыродна-рэкрэацыйны і гісторыка-культурны. Наяўнасць багатага культурнага і прыроднага патэнцыялу дазваляе краінам, якія нават не адносяцца да ліку найбольш эканамічна развітых, заваёўваць сур'ёзныя пазіцыі на сусветным турысцкім рынку. Абавязковая ўмова гэтага - правядзенне актыўнай дзяржаўнай палітыкі ў галіне развіцця турызму.

Для паспяховага развіцця экатурызму Беларусь мае багаты рэсурсны патэнцыял: шырокія прыродныя комплексы, якія добра захаваліся і ўключаюць помнікі прыроды, разнастайны раслінны і жывёльны свет, лясы, якія займаюць 7,4 млн га (36% тэрыторыі краіны). На тэрыторыі Беларусі больш за 10 тыс. азёр, каля 3 тыс. рэк даўжынёй 5 км і больш (Дняпро, Зах. Дзвіна, Нёман і інш.) і каля 20 тыс. малых рэк. Прыродныя комплексы Беларусі маюць важнае экалагічнае значэнне не толькі ў нацыянальным, але і ў міжнародным маштабе. У адпаведнасці з міжнародным пагадненнем аб стварэнні "зялёных лёгкіх Еўропы", падпісаным прадстаўнікамі ўрадавых органаў аховы навакольнага асяроддзя Беларусі, Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны і Эстоніі ў лютым 1993 г. у Варшаве, уся тэрыторыя Беларусі ўключана ў зону, якая прадстаўляе асаблівую экалагічную каштоўнасць для Ўсходняй і Цэнтральнай Еўропы. Асноўны прынцып развіцця на гэтай тэрыторыі агульнай плошчай 760 тыс. км2 вызначаны прынцып экалагічнага развіцця з прыярытэтам прыродаахоўных задач.

У межах «зялёных лёгкіх Еўропы» выдзелена 21 буйная прыродная тэрытарыяльная лакацыя, якая ўключае найбольш каштоўныя ў прыродных адносінах мясцовасці. 10 з іх поўнасцю або часткова размешчаны на тэрыторыі Беларусі:

1. Браслаўскія азёры (300 тыс. га);
2. Беларускія азёры, уключаючы возера Нарач;
3. Бярэзінскі біясферны запаведнік (1730 тыс.га);
4. Налібоцкая пушча (280 тыс. га);
5. Бабруйска-Барысаўскі раён (1260 тыс. га);

6. Усходняе Палессе (2625 тыс. га, у тым ліку ў Беларусі 1645 тыс. га);

7. Белавежская пушча (960 тыс. га, у тым ліку ў Беларусі 480 тыс. га);

8. Літоўскія азёры (2580 тыс. га, у тым ліку ў Беларусі 160 тыс. га);

9. Віцебскія і Латгальскія азёры (2020 тыс. га, у тым ліку ў Беларусі 480 тыс. га);

10. Даліна Заходняй Дзвіны (2325 тыс. га, у тым ліку ў Беларусі 255 тыс. га);

11. Даліна Буга (400 тыс. га, у тым ліку ў Беларусі 60 тыс. га).

Экалагічны турызм прадугледжвае не столькі наведванне прыродных тэрыторый: запаведнікаў, заказнікаў, нацыянальных паркаў і помнікаў прыроды, колькі экалагічную адукацыю і выхаванне, а таксама экалагічную дзейнасць, і спажыванне экалагічных рэсурсаў, у тым ліку і інфармацыйных. Экалагічныя рэсурсы - гэта ўласцівасці натуральнага балансу кампанентаў прыроднага асяроддзя (жывёл, раслінасці, глеб, клімату, рэльефу і г.д.), які фармаваўся без актыўнага ўплыву чалавечай дзейнасці. Галоўная каштоўнасць экалагічных рэсурсаў - прыродная натуральнасцьСпажываючы экалагічныя рэсурсы, адпачывальнікі атрымліваюць аздараўленчы і пазнавальны эфект.

Для арганізацыі экалагічнага турызму пажадана, каб меркаваны наведвальны аб'ект меў: унікальнасць і незвычайнасць, адпаведную экалагічную каштоўнасць і захаванасць, яскравасць і запамінальнасць, сувязь з гістарычным мінулым, якое апісана ў паданнях і легендах. Апроч гэтага аб'ект павінен быць здольны вытрымаць вялікі струмень турыстаў, інакш праз некаторы прамежак часу ён пачне дэградаваць і губляць прыродную каштоўнасць.

Апроч нацыянальных паркаў і запаведнікаў у сферы экалагічнага турызму неабходна і магчыма выкарыстоўваць і такія ахоўныя прыродныя тэрыторыі, як заказнікі і помнікі прыроды. Заказнікі - гэта тэрыторыі, выдзеленыя з мэтай захавання, аднаўлення аднаго або некалькіх відаў прыродных рэсурсаў і падтрымання агульнага экабалансу. Па выглядзе ахоўнай прыроднай каштоўнасці заказнікі могуць быць ландшафтныя, біялагічныя, гідралагічныя. Заказнікі маюць менш строгі рэжым наведвання, чым нацыянальныя паркі і запаведнікі і, згодна з законам Рэспублікі Беларусь "Аб ахоўных прыродных тэрыторыях і аб'ектах", могуць выкарыстоўвацца для навуковых, рэкрэацыйных, адукацыйных мэт. Помнікі прыроды – гэта незваротныя каштоўнасці ў экалагічных, навуковых, эстэтычных, гісторыка-культурных адносінах,

прыродныя аб'екты натуральнага паходжання, для якіх устаноўлены асаблівы рэжым аховы. Пры стварэнні экалагічных маршрутаў уключэнне ў іх помнікаў прыроды і заказнікаў дасць магчымасць знізіць нагрузку на буйныя запаведнікі і нацыянальныя паркі.

Для таго, каб экалагічны турызм мог станоўча ўплываць на гаспадарку і сацыяльную сферу краіны, а таксама быць рэальным прыярытэтным напрамкам устойлівага развіцця краіны, яго паняцце павінна ўбіраць тры асноўныя аспекты:

1) арыентацыя турыстаў на спажыванне экалагічных рэсурсаў;

2) захаванне натуральнага прыроднага асяроддзя;

3) падтрыманне традыцыйнага ўкладу жыцця насельніцтва перыферыйных рэгіёнаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Что такое экотуризм? Современные концепции экологического туризма // Фонд развития экотуризма “Дерсу Узала”. – [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ecotours.ru/blog/novosti-zapovednyh-turov1/chto-takoe-ekoturizm-sovremennaya-koncepciya-ekologicheskogo-turizma. – Дата доступа: 03.12.2024.

2. Экотуризм в Беларуси // Экосистема туризма. – [Электронный ресурс] – Режим доступа: https://ecojourney.by/ru/stati/1/1621/ekoturizm-v-belarusi. – дата доступа: 22.09.2024.

3. Государственная программа «Беларусь гостеприимная» на 2021–2025 годы // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 04.02.2021, 5/48743. – [Электронный ресурс] – Режим доступа: https://www.sportedu.by/wp-content/uploads/2017/11/Gosprogramma-Belarus-gostepriimnaya-na-2021-2025-gody.pdf. – Дата доступа: 21.05.2022.

4. Белко Д.Э. Развитие экологического туризма в Беларуси / Д.Э. Белко // 84 научно-техническая конференция профессорско-преподавательского состава, научных сотрудников и аспирантов (с международным участием). Минск, 25 февраля 2020 г. – Минск: БГТУ, 2020. – С. 206 – 209.

5. О развитии экологического туризма в Беларуси // Официальный портал Национального агентства по туризму. – [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.belarustourism.by/news/o-razvitii-ekologicheskogo-turizma/. – дата доступа: 11.01.2025.